# Кузьміч
## (Навела)



### Прысвячаю вашаму земляку Івану Юркіну, генерал-маёру, паэту

Знаёмцеся: Павел Чайка, сорак восем гадоў. Шынамантажнік. Прафесія яму падабаецца. Кажуць, ёсць людзі, у якіх работа «гарыць» у руках, а ёсць і такія, што спяць на хаду. Павел сваю працу выконваў нетаропка, але надзейна. Меў хватку. Сам збудаваў невялікі садовы домік, навёў шык у сталічнай двухпакаёўцы. Жонка Паўла працавала касірам у гастраноме. Маці жыла разам з сястрой настаўніцай. Сын — у прымах. Пасля службы ў войску Павел чатыры гады працаваў на трактарным заводзе, а шынамантажнікам – дваццаць.

Маладыя прадпрымальнікі падчас адраджэння капіталізму пачалі прыганяць з Германіі машыны. Цяпер амаль у кожнай сям'і ёсць уласны аўтамабіль.

Станцыя тэхагляду, дзе працаваў Павел, спачатку была дзяржаўнай, але знайшоўся нейкі гаспадар, які ўзяў у арэнду, ці выкупіў СТА. Працоўных не вельмі турбавала, хто гаспадар станцыі – грошы плацяць добрыя, а хто кіраўнік — хай турбуюцца падатковыя службы.

А завербаваў Паўла на станцыю яго сусед па дачы Нічыпар Кузьміч, ветэран вайны. Кузьміч сумаваў па шынамантажы і былых калегах. Яго прывазіў на станцыю ўнук, садзіўся каля ўвахода, курыў і слухаў апошнія навіны, якія расказвалі хлопцы і кліенты.

Павел паважаў Нічыпара Кузьміча, можа, таму, што стары нагадваў яму яго дзеда Ігната Кузьміча, які таксама быў ветэранам.

Аднойчы Паўлу патэлефанавала сястра.

– Паша, на хутары ў дзеда вішні паспелі. Калі хочаш, прыязджай. Мы прадалі старую хату дзеда на дровы, – сказала сястра. – Прыязджай, брацік, у госці.

Павел паабяцаў наведацца ў выхадныя.

Раней ён бываў на хутары часцей, але гэта было, калі дзед Ігнат быў жывы. Паўла цягнула на прыроду не толькі за садавінай і агароднінай, ён хлопцам усё лета адпачываў на канікулах у дзеда.

Павел успомніў, як дзед скардзіўся на шпакоў, якія заатакавалі старую вішню, і на ёй амаль не заставалася вішань. Зараз на адзінокім дрэве шпакоў не было.

– Бяры, Пашка, колькі давязеш, мы з мамай два вядры сабралі. Нам хопіць на варэнне, і замарозіць, – прапанавала сястра.

Пачуццё вялікай страты і суму ахапіла душу Паўла, калі ён убачыў на месцы старой хаты толькі чорныя вочы падвалін. Нарынулі ўспаміны пра дзеда, які расказваў хлопчыку пра вайну, пра франтавых сябрах. Але падлетак не вельмі жадаў слухаць яго расповеды і ўспаміны: малы быў, як кажуць, дурны. Паўлу больш падабалася сядзець на берагу ракі з вудай, пільнаваць паплавок, гуляць з сястрой у шахматы.

Павел паглядзеў на месца, дзе стаяла хата... Успомніў! На хаце дзеда Ігната вісела чырвоная зорачка – сімвал, што «ў гэтай хаце жыве ветэран вайны». Даведаўшыся ў сястры каму прадалі хату дзеда, Павел паспяшаўся ў суседнюю вёску.

Пакупнік ужо пачаў рэзаць бензапілой бярвенні на цуркі. Павел растлумачыў мужчыне, што яму патрэбна зорачка, як успамін пра дзеда. Той зразумеўшы пра што гаворка, аддаў Паўлу зорачку.

Спачатку думаў гэты сімвал перадаць у музей мясцовай школы, але сястра сказала, што няма там ніякага музея, ды і школы мабыць таксама хутка не будзе, бо з вёскі моладзь з'язджае у горад...

Дома жонка не вельмі была рада, што Павел прывёз зорку ў хату.

– Нельга ад нябожчыка трымаць рэчы ў хаце, — сказала Аксана. — Дома ёсць ікона Божай маці... Куды ты гэтую зорачку прылепіш? Аддай яе ў музей...

– На што яна ім? Гэта для іх рэч нязначная.

Жыццё само падкажа выйсце.

Некалькі дзён Нічыпар Кузьміч не прыязджаў на СТА. Аказалася, памёр Кузьміч, не дажыўшы тры гады да ста.

Павел вырашыў пагаварыць з гаспадаром станцыі: прымацаваць зорачку на сцяну перад уваходам у памяць пра Кузьміча. Але гаспадар запярэчыў:

– Яшчэ падумаюць гэтыя ветэраны, ды і колькі іх ужо засталося, што мы іх абслугоўваем за паўцаны ці дарма рэмантуем ім машыны...

– Ды старыя ўжо і не ездзяць да нас... — хацеў нешта яшчэ сказаць Павел. — Такія зорачкі пасля вайны былі прымацаваны амаль да кожнай хаты ў вёсцы — тут жыў ці жыве ветэран, а цяпер... — ён махнуў з прыкрасцю рукой.

– Не, не і не! Жадаючых на халяву цяпер хапае — дзеці, унукі, праўнукі...

– Кузьміч сорак гадоў адпрацаў на гэтай СТА. А калі сюды і прыедзе ветэран, то з майго заробка можаце вылічыць за яго абслугу, – адказаў Павел. Яго падтрымаў калега:

– Не бачу ніякай праблемы... Пагаджайцеся.

– Добра, угаварылі, прымацоўвай, — згадзіўся гаспадар.

І заззяла чырвоная зорачка на белай сцяне СТА.

**Георгій МАРЧУК**

Марчук, Г. Кузміч : (Навела) Прысвячаю вашаму земляку Івану Юркіну, генерал-маёру, паэту / Георгій Марчук // Шлях Кастрычніка. — 2021. — 17 лістапада. — С. 5.